# І. Уводзіны

Падчас Другой сусветнай вайны мільёны людзей трапілі пад акупацыю чужынцаў. Спачатку немцы акупавалі шматлікія еўрапейскія дзяржавы, з 1944 г. саюзнікі таксама акупавалі тэрыторыі, занятыя раней нямецкімі войскамі. Тым часам, на Усходзе Савецкі Саюз, які вызваліў краіны Цэнтральна-Усходняй Еўропы ад нацысцкага панавання, сам стаў акупацыйнай уладай. *Крэсы ўсходнія* (польскія ўсходнія тэрыторыі) зведалі на сабе праз захоп Чырвонай арміяй не другую, а ўжо трэцюю акупацыю, якія здарыліся паслядоўна. У верасні 1939 г. Польская дзяржава была падзелена ў выніку дамоўленасцей паміж савецкім і нямецкім кіраўніцтвам, вытарганых і замацаваных у тайным пратаколе да гітлераўска-сталінскага пакта. Нямецкі вермахт напаў на Польшчу 1 верасня і ў ходзе вайны за тры тыдні канчаткова перамог, а 17 верасня мяжу з Усходу перайшлі савецкія войскі. Апошнія польскія падраздзяленні капітулявалі 6 кастрычніка. Польшча была цалкам акупавана, урад і Вярхоўнае ваеннае камандаванне ўцяклі ў Румынію. 30 верасня вакол генерала Уладзіслава Сікорскага ўтварыўся ўрад у эміграцыі, які спачатку знаходзіўся ў Францыі, потым — у Лондане. Тым часам, насельніцтва Польшчы было аддадзена на волю нямецкіх і савецкіх акупантаў. Пасля яшчэ адных перамоў яны крышку перасунулі дэмаркацыйную лінію і забяспечылі сабе свабоду дзеянняў на адпаведных тэрыторыях уплыву. Немцы інкарпаравалі частку захопленых імі тэрыторый (Заходняй Прусіі, Познанскага краю, Верхняй Сілезіі, Вялікай Польшчы і інш.) у Трэці рэйх, а на астатняй частцы, Цэнтральнай Польшчы, паводзілі сябе як з акупаванай тэрыторыяй, называючы яе «генерал-губернатарствам». Саветы ж аддалі Віленшчыну, якая была захоплена яшчэ ў 1920 г., пасля кароткай акупацыі Літве, перш чым сваімі войскамі летам наступнага года анексаваць усю Прыбалтыку. Астатнія тэрыторыі, захопленыя Саветамі, былі далучаны да Беларускай (БССР) ці да Украінскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (УССР). Акупанты цалкам «перасрэсвалі» дзяржаўны апарат, арыштоўвалі і дэпартавалі дзясяткі тысяч былых высокапастаўленых асоб і чыноўных эліт польскай дзяржавы і цалкам перабудоўвалі эканоміку. Савецкі акупацыйны перыяд цягнуўся толькі каля двух гадоў. Нямецкі напад на Савецкі Саюз замяніў на колішніх *крэсах* савецкую акупацыю на нямецкую. На працягу якіх-небудзь трох гадоў мясцовае насельніцтва перажыло тры абсалютна розныя дзяржаўныя лады: аўтарытарны польскі, савецкі ды нямецкі нацыянал-сацыялістычны.

У ліпені 1944 г. Чырвоная армія пачала сваё буйное летняе наступленне. Толькі за некалькі тыдняў была разбіта нямецкая група армій Цэнтр, якая каля трох гадоў таму назад захапіла Беларусь, а цяпер тэ-

рыторыя зноў была ў руках Саветаў. Межы 1939 года былі адноўлены[1], а тэрыторыі рэсаветызаваны.

Такім чынам, у той час калі акупацыйныя ўлады ў параўнальна кароткія тэрміны захоплівалі колішнія *крэсы* і зноў пакідалі іх, мясцовае насельніцтва перажыло вайну як змену панавання дзвюх светапоглядна антаганістычных сістэм, якія ўносілі значныя парушэнні ў яго жыццё. Аднак гістарычнае даследаванне да гэтага часу не стварыла ніводнай навуковай працы, якая б занялася параўнальным разглядам двух акупацыйных рэжымаў на тэрыторыі сённяшняй Заходняй Беларусі[2]. Вось чаму немагчыма знайсці ніякіх меркаванняў пра тое, якія ўплывы пакінула савецкая акупацыя на паводзіны насельніцтва падчас нямецкай. Можна прывесці шмат прычын гэтых паводзін, якія ўзаемазвязаны з рознымі сферамі інтарэсаў розных нацыянальных груп. Савецкая гістарыяграфія прадстаўляла анексію Усходняй Польшчы як прэвентыўную акцыю для абароны тамтэйшага насельніцтва ад немцаў, якая, да таго ж, прынесла вызваленне ад буржуазна-капіталістычнай прыгнятальніцкай польскай дзяржавы. Большасцю насельніцтва колішніх *крэсаў*, паводле савецкіх сцверджанняў, прыход Чырвонай арміі і наступнае пераўтварэнне грамадскага ладу прымаліся з энтузіязмам[3]. Стэрэатыпнае выкарыстанне тэрміна «Вялікая Айчынная вайна» адносна нямецка-савецкай вайны 1941—1944 гг., акрамя таго, вырывала яго з кантэксту Другой сусветнай вайны і, тым самым, затушоўвала ўсякую сувязь з савецкай агрэсіяй у 1939—1941 гг. супраць Польшчы, Фінляндыі, Бесарабіі і Прыбалтыкі[4]. Нават пасля таго, як пасля 1989 г. Савецкі Саюз больш не мог адмаўляць наяўнасць тайнага дадатковага пратакола да гітлераўска-сталінскага пакта, які рэгуляваў падзел частак Цэнтральна-Усходняй Еўропы паміж двума дыктатарамі, гэтыя падыходы амаль не змяніліся. Пакт Гітлера-Сталіна разам з яго дадатковым пратаколам расцэньваўся як неабходны захад савецкай палітыкі бяспекі, пры дапамозе якога Савецкі Саюз імкнуўся аддаліць нямецкую пагрозу ад уласных межаў[5].

[1] Адзіным выключэннем была Беласточчына, у 1939 г. таксама далучаная да Саветаў, але з прычыны перавагі польскага насельніцтва пасля вайны зноў была далучана да Польшчы.

[2] Праўда, маюцца два адпаведныя даследаванні ў адносінах да іншых рэгіёнаў на польскай усходняй тэрыторыі: Hryciuk G. Polacy we Lwowie 1939—1944. Życie codzienne. Warszawa, 2000, дзе даследуецца сітуацыя палякаў у акупаваным Львове, Lewandowska S. Życie codzienne Wilna w latach II wojny światowej. Warszawa, 2001 — тое ж, толькі ў Вільні. Аднак абодва даследаванні грунтуюцца ў значнай ступені на польскіх крыніцах і не ўлічваюць савецкія і нямецкія.

[3] Гл., напр.: Мисаревич Е. На освобожденной земле. Политическая работа в западных областях Белоруссии (сентябрь 1939 — июнь 1941 гг.). Минск, 1989.

[4] Параўн.: Slutsch S. 17. September 1939: Der Eintritt der Sowjetunion in den Zweiten Weltkrieg. Eine historische und völkerrechtliche Bewertung // VfZ. 2000. № 48.

[5] Паводле: Волков В., Гибиянский Л. Восточная Европа между Гитлером и Сталиным 1939—1941 гг. Москва, 1999. С. 77—197.

У заснаванай у 1991 г. Рэспубліцы Беларусь, якая ахоплівае і ўсходнія польскія тэрыторыі, анексаваныя ў 1939 г., акрамя Беласточчыны, шмат хто з гісторыкаў апраўдвае інкарпарацыю колішніх *крэсаў* тым аргументам, што гэта быў «акт гістарычнай справядлівасці», які вярнуў беларускаму народу яго дзяржаўнае адзінства[6]. Пры такой ідэалагічна абумоўленай настроенасці постсавецкая беларуская гістарыяграфія не ставіць пад сумненне тэрміну «Вялікая Айчынная вайна». Таму і даследавання насельніцтва за ўвесь перыяд з 1939—1944 гг. да гэтага часу не прадугледжвалася.

У заходняй гістарыяграфіі, наадварот, адказным за тое, што гэтая пустата не была запоўнена, было засяроджанне на нямецкім акупацыйным апараце. Даследаванні наконт Польшчы абмяжоўваліся генерал-губернатарствам і тэрыторыямі, уключанымі ў склад Рэйху[7]. Тэрыторыі, акупаваныя Савецкім Саюзам, прыцягвалі да сябе ўвагу ў шматлікіх даследаваннях амаль выключна ў дачыненні да нямецкай акупацыі з 1941 г. Насельніцтва ў гэтых працах выступала найбольш толькі як аб'ект дзеянняў нямецкай акупацыйнай улады, а не ў функцыі фактара, які дзейнічае самастойна. Да таго ж большасць даследаванняў разглядалі ўсю тэрыторыю нямецкага панавання ў Савецкім Саюзе[8], ці, прынамсі, буйныя тэрытарыяльныя адзінкі[9]. Толькі ў 90-х гадах мінулага стагоддзя Беларусь усё часцей рабілася прадметам асобных даследаванняў. У 1990 г. Паўль Коль апублікаваў кнігу, у якой сведкі апісвалі зверствы

[6] Гл., напр.: Великая Отечественная война 1941—1945. Военно-исторические очерки. Москва, 1998—1999. С. 31; а таксама праграмны загаловак зборніка, які быў выдадзены ў 1999 г. беларускай дзяржавы з нагоды 60-годдзя гэтага «Аб'яднання»: Назаўсёды разам. Да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Пад агул. рэд. М.П.Касцюка, І.Я.Навуменкі. Мінск, 1999.

[7] Гл., напр.: Gross J. Polish Society under German Occupation. The Generalgouvernement, 1939—1944. Princeton. NJ, 1979; Broszat M. Nationalsozialistische Polenpolitik. 1939—1945. Stuttgart, 1961; Lukas R. The Forgotten Holocaust. The Poles under German Occupation, 1939—1945. New York, 1997; Madajczyk C. Die Okkupationspolitik Nazideutschlands in Polen 1939—1945. Berlin (Ost), 1988.

[8] Як, напр., выказванні: Dallin A. Deutsche Herrschaft in Russland 1941—1945. Eine Studie über Besatzungspolitik. Düsseldorf, 1958; Reitlinger G. Ein Haus auf Sand gebaut. Hitlers Gewaltpolitik in Russland 1941—1944. Hamburg, 1962. Але і больш новыя выказванні: Förster J. Das Unternehmen «Barbarossa» als Eroberungs- und Vernichtungskrieg // Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg. Bd. 4; Förster J. Die Sicherung des «Lebensraumes» // Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg. Bd. 4; Mulligan T. The Politics of Illusion and Empire. German Occupation Policy in the Soviet Union, 1942—1943. New York [et al.], 1988; Umbreit H. Die deutsche Herrschaft in den besetzten Gebieten 1942—1945 // Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg. Bd. 5/2; Umbreit H. Strukturen deutscher Besatzungspolitik in der Anfangsfhase des deutsch-sowjetischen Krieges // Zwei Wege nach Moskau.

[9] Гл., напр.: Anisimov O. The German Occupation in Northern Russia during World War II: Political and Administrative Aspects. New York, 1954; Handrack H.-D. Das Reichskommissariat Ostland. Die Kulturpolitik der deutschen Verwaltung zwischen Autonomie und Gleichschaltung 1941—1944. Hannover, Münden, 1981.

нямецкіх акупантаў[10]. На адкрытай у 1994 г. выставе «Знішчальная вайна, злачынствы вермахта ў 1941—1944 гг.», якая выклікала супярэчлівыя водгукі, гэтай тэрыторыі была прысвечана адна з трох секцый[11], а ў 1999 г. з'явілася аб'ёмістая праца берлінскага гісторыка Крысціяна Герлаха аб нямецкай знішчальнай палітыцы ў Беларусі[12]. Але і гэтыя даследаванні засяроджваліся на акупацыйным апараце.

Адначасова з'явіліся і першыя даследаванні, якія большую ўвагу звярнулі на мясцовае насельніцтва. Беларускі гісторык Юры Туронак, які жыве ў Польшчы, у 1989 г. апублікаваў кнігу, у якой ён побач з акупацыйным апаратам даследуе найперш мясцовых нацыяналістаў, якія супрацоўнічалі з немцамі[13]. Праўда, іх вобраз не быў вольны ад апалагетычнай тэндэнцыйнасці. Як нямецкі генеральны камісар Вільгельм Кубэ, так і мясцовыя дзеячы цалкам апраўдваліся ад абвінавачванняў за ўдзел у Халакосце, і адначасова выключна станоўча ацэньваліся іх выступленні за беларускую нацыянальную дзяржаву[14]. Праз восем гадоў, з выхадам кнігі Бернгарда К'яры, з'явілася першае пераканаўчае апісанне акупацыйных будняў у Беларусі, якое разглядала не толькі акупантаў, але і мясцовае цывільнае насельніцтва як дзеючых суб'ектаў[15]. У сваім уступе К'яры, акрамя таго, закранае савецкую акупацыю і ў даследаванні ўвесь час звяртаецца да вопыту стасункаў насельніцтва з камуністамі як важнага тлумачальнага фактару. Але ён не праводзіць дакладнага даследавання савецкага перыяду. Акрамя таго, з-за аб'ёму аналізаванай геаграфічнай прасторы, ён часта не выходзіць за рамкі апісання адзінкавых феноменаў. Ад гэтага перад вачыма чытача хоць і з'яўляецца пластычны малюнак акупацыйных будняў, але больш дакладныя сведчанні пра рэпрэзентатыўнасць і эфектыўнасць апісаных момантаў немагчымыя.

Дзякуючы тэрытарыяльнаму засяроджанню толькі на рэгіёне, які паддаецца агляду, у наступных раздзелах даследуецца паслядоўная змена двух акупацыйных рэжымаў з 1939 да 1944 гг., і пры гэтым асноўная ўвага скіравана на пытанне, як насельніцтва ўспрымала гэтыя два рэжымы і як яно рэагавала на іх. Адначасова даецца адказ, у прыватнасці, на тры галоўныя пытанні: якія прыстасавальніцкія стратэгіі ажыццяўляла насельніцтва? Хто аказваў супраціўленне, хто

---

[10] Kohl P. Der Krieg der deutschen Wehrmacht und der Polizei 1941—1944. Sowjetische Überlebende berichten. Frankfurt a.M., 1995.

[11] Гл.: Vernichtungskrieg. Verbrechen der Wehrmacht 1941 bis 1944. Ausstellungskatalog. Hamburg, 1997.

[12] Gerlach C. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 1999.

[13] Turonek J. Białoruś pod okupacją niemiecką. Warszawa, Wrocław, 1989.

[14] Гл. рэцэнзію: Chiari B. «Nationale Renaissance». Belorussifizierung und Sowjetisierung: Erziehungs- und Bildungspolitik in Weißrussland 1922—1944 // JBfGOE. 1994. № 42. S. 599—601.

[15] Chiari B. Alltag hinter der Front. Besatzung, Kollaboration und Wiederstand in Weißrussland. 1941—1944. Düsseldorf, 1998.

супрацоўнічаў з акупантамі? Якія канфлікты здараліся ў насельніцтва, і ці былі яны звязаны з адрозненнямі ў нацыянальнасці паміж асобнымі насельнікамі? Апошняе пытанне вынікае з абставін, што колішнія *крэсы* былі мультыэтнічным рэгіёнам, у якім пражывалі ў першую чаргу беларусы, палякі і яўрэі, але дзе можна было сустрэць і рускіх, і ўкраінцаў.

Такім чынам, галоўная мэта гэтай працы не палягае ў тым, каб паказаць сам акупацыйны рэжым і яго палітыку, а прааналізаваць паводзіны насельніцтва ва ўмовах абодвух рэжымаў. Сама акупацыйная палітыка, якая павінна служыць толькі фонам паводзін мясцовых людзей, па магчымасці шырока, паказваецца праз літаратуру. Тое самае тычыцца і дзейнасці савецкіх партызанаў і польскай «Арміі Краёвай». Абодва супраціўленчыя рухі таксама не даследуюцца *in toto*, увага на іх скіроўваецца толькі тады, калі яны непасрэдна ўплываюць на жыццё насельніцтва. З той прычыны, што абодва супраціўленчыя рухі ў немалой сваёй частцы папаўняліся з асяроддзя насельніцтва, узаемадзеяннем паміж супраціўленнем і насельніцтвам надаецца асаблівае значэнне, якому павінны адпавядаць і аналіз. Там, дзе мінулых вынікаў даследаванняў для выяўлення акупацыйнай палітыкі і падпольнага руху не хапала, гэта праца паспрабуе дапоўніць іх з крыніц, прынамсі, наколькі гэта неабходна для разумення паводзін мясцовага насельніцтва. Адпаведна гэтаму, тут цікавасць выклікае толькі палітыка, якая ажыццяўлялася на месцы, а не генезіс загадаў, на якіх яна грунтавалася.

Ва ўсіх гэтых пытаннях будзе закранута і сувязь паміж савецкім і нацысцкім акупацыйным панаваннем. У якой меры ўплываў вопыт савецкай акупацыі на паводзіны насельніцтва пры нямецкім рэжыме і якія канкрэтныя вынікі меў гэты ўплыў? Пры гэтым для аналізу савецкага перыяду, вядома, не павінен затушоўвацца ўплыў на насельніцтва мінулага 18-гадовага польскага панавання, што прасочваецца на грунце багатай літаратуры, якая тычыцца польскага міжваеннага часу, хоць пры гэтым мы адмовіліся ад падрабязнага аналізу. Аўтар адмаўляецца таксама ад пашырэння даследавання за кошт часу пасля новага захопу Беларусі Чырвонай арміяй летам 1944 г. Несумненна, адказ на пытанне, які ўплыў зрабіла чаргаванне дзвюх акупацый з 1939 г. на паводзіны насельніцтва пры новым захопе тэрыторыі Саветамі, і наколькі другая саветызацыя з 1944 г. адрознівалася ад першай, было б варта даць пры разглядзе праблематыкі, якая даследуецца тут. Праўда, пры гэтым давялося б выйсці далёка за часавыя рамкі Другой сусветнай вайны, а даследаванне расцягнуць прыкладна да канца саракавых гадоў, калі саветызацыя была цалкам завершана.

У гэтым даследаванні не было імкнення напісаць мікрагісторыю ў сэнсе гісторыі нейкіх асоб, сем'яў ці вёсак. Гэта, напэўна, і не атрымалася б з-за недахопу крыніц[16]. Пры гэтым, навуковае даследаванне акупацыйнай палітыкі яшчэ не прасунулася настолькі, каб можна было

[16] Chiari B. Alltag… S. 6.

рабіць дакладныя выказванні пра варункі ў асобных раёнах, валасцях ці вёсках. З другога боку, спроба даследаваць усю Беларусь ці толькі яе значную частку здаецца занадта грубай, каб паказаць рэгіянальныя адрозненні і своеасаблівасці ў дзеяннях асобных груп. Зыходзячы з названых пярэчанняў, падаецца больш прымальным спыніцца на сярэднім узроўні, прычым даследаваць адзін рэгіён, размешчаны хоць і ў складзе ўсёй БССР ці заснаванага немцамі «Генеральнага камісарыята Беларусь», але які ўяўляў сабой, тым не менш, самастойную адміністрацыйную адзінку. Гэта асабліва тычыцца часу нямецкай акупацыі, калі ніжэй выбранага ўзроўню гэбітскамісарыята не існавала ніякай нямецкай адміністрацыйнай структуры. Для паказу аблічча мясцовых насельнікаў гэта азначае, што трэба паспрабаваць сфармаваць групы, якія ў пэўных сітуацыях паводзілі сябе аднолькава ці з аднолькавымі адносінамі да іх. Дзе гэта было магчыма, прыводзяцца, як прыклад, асобныя выпадкі ці асобы для ілюстрацыі адпаведных паводзін. Гэта, з аднаго боку, абумоўлена крыніцамі, а з другога — патрэбай атрымаць дастаткова інфармацыі пра асобу, але не павінна выклікаць думкі пра адсутнасць цікавасці да асобнага чалавека, лёс якога ў брутальных умовах вайны часта бываў невыказна трагічным ці жорсткім. Пры вызначэнні тэрыторыі выбар выпаў на Баранавічы, што тлумачыцца наступным чынам: побач з Баранавічамі была яшчэ толькі Вілейка, як пры Саветах — адміністрацыйным *абласным* цэнтрам, так і пры немцах цэнтрам аднаго з гэбітскамісарыятаў. Як месца размяшчэння адпаведных акупацыйных установ гэтая падвойнасць абяцала асабліва спрыяльны доступ да крыніц. Транспартна-тэхнічнае значэнне Баранавічаў як важнага вузла чыгуначнага руху Поўнач-Поўдзень і Усход-Захад робіць іх больш каштоўным аб’ектам даследаванняў, чым перыферыйная Вілейка. Да таго ж, Баранавіччына з 1942 г. ператварылася ў ачаг узброенага супраціву, як савецкага, так і польскага.

Заснаваная ў 1939 г., Баранавіцкая вобласць утварылася ў асноўным на тэрыторыі польскага Навагрудскага ваяводства і займала восем паветаў (акруг): Баранавіцкі, Валожынскі, Лідскі, Нясвіжскі, Навагрудскі, Стаўбцоўскі, Шчучынскі і Слонімскі. 15 студзеня 1940 г. яна была рэфармавана і падзелена на 26 раёнаў. Гарады Ліда і Баранавічы былі падпарадкаваны непасрэдна вобласці, сем іншых гарадоў і дзесяць найбуйнейшых пасёлкаў — адпаведным раёнам. Агулам вобласць займала плошчу ў 23 300 км$^2$ з насельніцтвам каля 1,18 мільёнаў чалавек[17]. Калі немцы ў чэрвені 1941 г. занялі вобласць, яна непрацяглы час падпарадкоўвалася Камандуючаму тылавога раёна групы армій Цэнтр генералу Максу фон Шэнкендорфу, перш чым быць перададзенай 1 верасня таго ж года з астатнімі заходнебеларускімі тэрыторыямі цывільнай адміністрацыі. Каля паловы заходнебеларускіх земляў ды Міншчына былі аб’яднаныя ў «Генеральны камісарыят Беларусь» пад кіраўніцтвам

[17] Адміністратыўна-тэрытарыяльны падзел Беларусі. Мінск, 1985. С. 14; Административно-территориальное устройство БССР. Справочник в 2-х томах. Т. 1 (1917—1941 гг.). Минск, 1985. С. 112, 117, 120 і 161.

Вільгельма Кубэ, былога гаўляйтара Курмаркі, які разам з генеральнымі камісарыятамі Эстонія, Латвія і Літва ўваходзіў у «рэйхскамісарыят Остланд» пад кіраўніцтвам рэйхскамісара Гінрыха Лозэ. У генеральным камісарыяце былі ўтвораны адзінаццаць гэбітскамісарыятаў, з ліку якіх Баранавіцкі, Лідскі, Слонімскі і Навагрудскі знаходзіліся на тэрыторыі былой Баранавіцкай вобласці[18]. Баранавіцкі гэбітскамісарыят займаў шэсць тысяч квадратных кіламетраў і тут пражывалі 350 000 чалавек[19].

Ужо адно гэта ставіць пытанне, што павінна было разглядаць гэта даследаванне — тэрыторыю савецкай ці нашмат меншай нямецкай адміністрацыйнай адзінкі. На карысць абодвух варыянтаў мелася б дастаткова аргументаў. У дадзеным выпадку выбар зроблены на карысць нямецкай адміністрацыйнай адзінкі «гэбітскамісарыята», што матывуецца наступным чынам: па-першае, разгляд Баранавіцкай вобласці, выходзячы за рамкі 1941 г., запатрабаваў бы працы з рознымі гэбітскамісарыятамі, што часткова ахопліваюць і тэрыторыі, якія знаходзіліся па-за межамі старой вобласці. Значыць, тэрытарыяльнай цэласнасці нельга было дамагчыся і на гэтым шляху. Па-другое, здаецца, што поле дзейнасці нямецкіх гэбітскамісараў было непараўнальна большым, чым камісараў савецкіх абласных ці, тым больш, раённых камітэтаў Камуністычнай партыі. Гэта абумоўлівае тое, што і палітыка ў асобных гэбітскамісарыятах больш адрознівалася паміж сабой, чым у асобных раёнах. Пры выбары на карысць вобласці ў якасці прадмета даследаванняў па гэтай прычыне спатрэбіўся б больш дэталёвы разгляд акупацыйнай палітыкі. Каб пры выбраным метадзе гарантаваць як мага большую тэрытарыяльную цэласнасць, як для савецкага перыяду, так і для савецкага і польскага падполля, для аналізу прыцягваюцца толькі тыя рэгіёны, якія пазней знаходзіліся ў Баранавіцкім гэбітскамісарыяце. Аднак адсутнасць даных наконт месцаў, а таксама недастатковыя расшыфроўкі тэрыторый у паведамленнях не заўсёды дазваляюць рабіць гэта. Калі аб тэрыторыі, якая даследуецца, няма ніякіх даных, з прагматычных прычын як аснова бярэцца вобласць; калі і яе нельга знайсці ў крыніцах, то могуць быць прыведзеныя даныя наконт Заходняй Беларусі ўвогуле ці генеральнага камісарыята.

Галоўная цяжкасць у даследаванні сфармуляваных вышэй галоўных пытанняў вынікае з таго, што канцэнтрацыя ўвагі робіцца на мясцовым насельніцтве, якое ў большасці не пакінула пісьмовых сведчанняў. Даведку пра іх настрой і паводзіны з гэтай прычыны ў большасці выпадкаў можна атрымаць толькі з дакументаў трэціх асоб. І ўсё-такі становішча з крыніцамі нядрэннае: на перыяд савецкай акупацыі по-

[18] Gerlach C. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 1999. S. 160—163. Утвораныя на ўзроўні паміж генеральнымі і гэбітскамісарыятамі гаўпткамісарыяты дэ-факта не займелі ніякага значэння. Гэта тычылася і Баранавіцкага гаўпткамісарыята пад кіраўніцтвам групэнфюрара СА Фрыдрыха Фенца. Тамсама. S. 166.

[19] Гэбітскамісар Баранавіччыны Вернер. Данясенне пра выкананую работу і абагулены досвед ад 11.08.1944. BA. R 93/13. Арк. 42—76. Тут арк. 44.

бач са шматлікімі справаздачамі партыйных органаў маюцца і дакументы сакрэтных службаў. Нават калі гэты від крыніц не беспраблемны[20], ён, пры строгай крытычнай працы, дае непаўторную магчымасць зірнуць на клопаты, праблемы і матывы дзеянняў насельніцтва, яго палітычны настрой і прыклады, праз якія яно ўспрымала палітыку. Акрамя таго, ёсць нейкая нязначная колькасць паведамленняў польскага падполля. Увогуле, дакументы, якія дайшлі да нас, хоць і даюць магчымасць грунтоўна зазірнуць у сярэдзіну палітыкі Савецкай улады ў Баранавіччыне, а таксама на ўзоры паводзін насельніцтва, тым не менш, шмат пытанняў застаюцца яшчэ адкрытымі. Прычына, пэўна, не ў апошнюю чаргу палягае ў тым, што ў выніку масавых уцёкаў Саветаў ад наступаючых немцаў процьма дакументаў была страчана. Паводле меркаванняў, матэрыял, які застаўся, складае не больш 5 — максімум 10 % ад таго, што было створана адпаведнымі ўстановамі[21]. Працу абцяжарвае яшчэ і тое, што дакументы савецкіх выканаўчых органаў (*выканкамаў*) у Беларусі ўсё яшчэ недаступныя для грамадскасці. А гэтыя ж органы мелі самыя непасрэдныя кантакты з насельніцтвам, таму што ім было даручана ажыццяўленне рашэнняў зверху. У іх фондах знаходзяцца таксама просьбы насельніцтва[22], якія могуць уяўляць сабой важныя крыніцы ўспрыняцця імі Савецкай улады. Таксама пад замком знаходзяцца шматлікія дакументы Народнага камісарыята ўнутраных спраў (НКУС), паколькі яны даюць звесткі не пра настрой насельніцтва, а пра дакладную дзейнасць саміх чэкістаў. Праз гэта веды пра абыходжанне з палітычнымі праціўнікамі і пра памеры рэпрэсій усё яшчэ даволі фрагментарныя. Праўда, два выданні дакументаў, якія ажыццявіліся праз супрацоўніцтва польскага і расійскага міністэрстваў унутраных спраў і публікуюць дакументы з архіваў расійскай ФСБ, змаглі запоўніць некаторыя з гэтых прагалаў[23].

За перыяд нямецкай акупацыі, на жаль, не існуе ніводнага віду крыніц, параўнальнага з дакладамі НКУС, хаця здаецца, што і немцы насаджалі мясцовых інфарматараў. Акрамя таго, даклады аператыўных

[20] Пра каштоўнасць паведамленняў НКУС гл.: Velikanova O. Berichte zur Stimmungslage. Zu den Quellen politischer Beobachtung der Bevölkerung in der Sowjetunion // JBfGOE. 1999. № 47. S. 234—236; Davies S. Popular Opinion in Stalin’s Russia. Terror, Propaganda and Dissent, 1934—1941. Cambridge, 1997. P. 11—13; Holquist P. «Information Is the Alfa and Omega of Our Work»: Bolshevik Surveillance and Its Pan-European Context // JMH. 1997. № 69. P. 448; Werth N. Une source inédite: les svodki de la TSCHÉKA-OGPU // Revue des études slaves. 1994. № 66. P. 25—27; Изможик В. Глаза и уши режима. Государственный политический контроль за населением советской России в 1918—1928 годах. Санкт-Петербург, 1995. С. 130.

[21] Еленская И. Документы госархива Брестской области 1939—1941 гг.: характеристика источников // Советизация и русификация. С. 224.

[22] Выказванне адной супрацоўніцы Архіва Мінскай вобласці аўтару.

[23] Deportacje obywateli polskich z Zachodniej Ukrainy i Zachodniej Białorusi w 1940 roku. Red. Grzegorz Jakubowski [i inni]. Warszawa, Moskwa, 2003; Polskie podziemie na terenach Zachodniej Ukrainy i Zachodniej Białorusi w latach 1939—1941. 2 tomy. Warszawa, Moskwa, 2001.

груп СС утрымліваюць даныя наконт агульнага настрою, палітычнай пазіцыі і канкрэтных паводзінаў насельніцтва, але яны тычацца вялізнай тэрыторыі, якая выходзіць далёка за межы Баранавіцкага гэбітскамісарыята, так што не заўсёды бачна, дзе дакладна адбыліся падзеі, якія апісваюцца. Тое самае тычыцца і данясенняў ваенных падраздзяленняў і буйных злучэнняў Камандуючага тылавым раёнам групы армій Цэнтр, якія праходзілі праз тэрыторыю, а таксама часцей, адказных за ахову. Аднак нельга абысціся без выкарыстання гэтых дакументаў, асабліва на пачатку, калі іншых няма. З часу ўтварэння ў верасні 1941 г. цывільнай адміністрацыі захавалася шмат нямецкіх дакументаў неваеннага паходжання. У той жа час спадчына ваенных дакументаў невялікая. З утвораных у Баранавіцкім гэбітскамісарыяце мясцовых камендатур, а таксама палявой і галоўнай палявой камендатуры, амаль не захавалася ніякіх дакументаў. Асабліва варта жалю адсутнасць дакументаў ахоўных часцей за перыяд з красавіка 1942 г. да студзеня 1944 г. У гэты час ахова тэрыторыі была даручана 202-й ахоўнай брыгадзе, дакументацыя якой, відавочна, уся цалкам знішчана. Дакументацыя цывільных установаў захавалася таксама толькі фрагментарна. Яшчэ ў большай ступені гэта тычыцца паведамленняў жандармерыі. Хаця Баранавіччына належаць да нешматлікіх гэбітскамісарыятаў, у якіх увогуле захаваўся адпаведны фонд, але і ён, на жаль, пакрывае толькі маленькі прамежак часу агульнага перыяду акупацыі[24]. Але ён, ва ўсякім разе, дае ўяўленне пра задачы, якія даручаліся не толькі жандармерыі, але і мясцовай ахоўнай паліцыі, і пра тое, як яна выконвала гэтыя задачы ў барацьбе з партызанамі і ў знішчэнні яўрэяў. Апошняе ад недахопу першасных крыніц не паддаецца адлюстраванню без звароту да судовых актаў пасляваеннага часу, не заўсёды бясспрэчных[25].

Таксама толькі фрагментарна, але ўсё яшчэ ў вялікай колькасці, дайшлі да нас дакументы мясцовай адміністрацыі, якую немцы ўтваралі ніжэй узроўню гэбітскамісарыята. Яны ўяўляюць сабой непасрэдна пазнавальную цікавасць для гэтага даследавання, таму што яны даюць малюнак дзеянняў мясцовых на службе ў немцаў, а таксама пра тое, як яны паводзілі сябе ў адносінах да астатняга насельніцтва. Заявы з просьбамі і паведамленні ад насельніцтва супрацоўнікам акупацыйных установаў, якія таксама захаваліся ў гэтых фондах, даюць не толькі ўяўленне пра клопаты і патрэбы, але і дазваляюць, акрамя таго, убачыць цікавае ў шаблоне іх успрыняцця.

Акрамя акупацыйных дакументаў маецца вялікая колькасць дакументаў савецкага супраціўлення. Як падпольныя структуры Камуністычнай партыі і яе моладзевай арганізацыі камсамола, так і самі патрызаны пакінулі вялікую колькасць папер, якія праясня-

---

[24] Тут маецца на ўвазе фонд 995 у Дзяржаўным архіве Брэсцкай вобласці (ДАБВ). Брэст.

[25] Адносна праблематыкі судовых актаў гл., у першую чаргу, дысертацыю Катрын Штоль, Білефельд (Katrin Stoll, Bielefeld).

юць іх дзеянні, дзеянні акупантаў, а таксама насельніцтва. Хоць яны шматкроць і ўтрымліваюць перабольшанні ці недакладнасці — асабліва ўласныя поспехі ахвотна перабольшваюцца, а нямецкія, наадварот, прыніжаюцца ці ўвогуле не згадваюцца, — вялікая колькасць дакументаў дазваляе, аднак, чытаць іх «паміж радкоў». Асабліва вялікую каштоўнасць маюць паведамленні ніжніх узроўняў сваім непасрэдным начальнікам на месцах. У той час, калі кіраўніцтва падполля на абласным узроўні рабіла справаздачу органам, якія знаходзіліся на вялікай адлегласці, і магло адпаведна «прыўкрасіць» свае паведамленні, яно само, каб быць у стане камандаваць, таксама залежала ад дакладнага ведання становішча на месцах. Яно было таксама ў лепшым становішчы, чым Цэнтр у Маскве, каб праз эмісараў праверыць змест накіраваных яму паведамленняў наконт іх праўдзівасці. Па гэтай прычыне дакументы больш нізкага ўзроўню партызанскага руху даюць больш дакладны малюнак, чым вышэйшага[26]. І ўсё-такі гэты від крыніц пры выкарыстанні патрабуе асаблівай асцярожнасці.

Тое самае тычыцца, на жаль, значна больш малалікіх рапартаў польскага падполля. Праўда, адкрытасць, з якой дакументы паведамляюць і пра свае няўдачы, сведчыць пра больш высокую меру надзейнасці. Наадварот, патрабуецца асцярожнасць у адносінах да апісання савецкіх партызанаў, якія як праціўнікі польскагасупраціву часта падаюцца выключна ў негатыўным святле[27].

Нарэшце, і прадстаўнікі беларускага нацыянальнага руху, якія супрацоўнічалі з немцамі, стваралі свае дакументы. Яны, з аднаго боку, даюць уяўленне пра ўласную зацікаўленасць мясцовых функцыянераў, з другога боку — пра пазіцыю астатняга насельніцтва.

Увогуле, гісторык, разглядаючы Баранавіцкі гэбітскамісарыят падчас нямецкай акупацыі, тым самым, мае магчымасць асвятляць падзеі і рэакцыі на іх на месцы з розных, часта абсалютна дыяметральных пазіцый.

Акрамя таго, на перыяд абедзвюх акупацый маюцца шматлікія паведамленні сведак, больш — ад палякаў і яўрэяў, адзінкавыя — ад беларусаў. Першыя такія паведамленні, якія, праўда, апісваюць толькі перыяд ад прыходу Чырвонай арміі да 1940 г., належаць пяру асоб, якія былі дэпартаваны камуністамі ў 1940 г. на «старыя» савецкія тэрыторыі. У 1942 г. каля дванаццаці тысяч з іх — як частка заснаванай паводле дамоўленасці паміж савецкім і польскім урадамі польскай арміі пад камандаваннем Уладзіслава Андэрса — былі перапраўлены ў Іран. Урад Сікорскага прасіў іх аб тым, каб яны занатавалі свае ўражанні ад савецкай акупацыі. Гэтыя данясенні (*relacje*) былі пры-

[26] У публікацыі: Sowjetische Partisanen in Weißrusslnand. Innenansichten aus dem Gebiet Baranowitschi 1941—1944. Eine Dokumentation. Hrsg. von Bogdan Musial. München, 2001. S. 22, — сцвярджаецца, што страты праціўніка ў справаздачах бываюць тым большымі, чым больш высокая пасада таго, хто паведамляе.

[27] Пра гэта падраздзел VI.2 гэтай працы.

везены ў Лондан і пасля вайны размешчаны ў Архіве Гувера (Hoover Archives) у Стэнфардзе (Stanford). Тым часам, копіі знаходзяцца ў Варшаве ва Усходнім Архіве *(Archiwum Wschodnie)*[28]. *Рэляцыі* маюць, з аднаго боку, тую перавагу, што былі створаны адносна блізка да часу падзей, з другога боку — недахоп, што ўсе яны напісаны людзьмі, якія сталі ахвярамі брутальнага савецкага акупацыйнага рэжыму. Не ў апошнюю чаргу з гэтай прычыны, яны схільныя да аднабаковасці. Ва Усходнім Архіве знаходзяцца таксама іншыя ўспаміны былых жыхароў колішніх *крэсаў*, упарадкаваныя паводле месца паходжання. Яны ствараліся і дасылаліся ў Архіў з канца 80-х гадоў мінулага стагоддзя і таму не толькі надзвычай суб’ектыўныя, але і напісаны праз больш чым 40 гадоў пасля падзей.

У Архіве Яўрэйскага гістарычнага інстытута ў Варшаве (*Archiwum Żydowskiego Instytutu Historycznego*) захоўваюцца паведамленні яўрэяў, якія ацалелі пасля Халакосту, у тым ліку і дакументы з Баранавіччыны. Яны напісаны часткова непасрэдна пасля вайны, але часткова і праз значны адрэзак часу ў некалькі дзесяцігоддзяў пасля падзей, так што іх тычыцца тое самае, што і рэляцый. Аднак гэтыя абодва віды крыніц неабходныя. Асабліва без іх нельга было б сабе ўявіць фазы змены панавання ў 1939 і 1941 гг.

Яшчэ адзін від крыніц, якім карыстаўся К’яры для сваёй працы і які ён назваў «адзінай такога кшталту крыніцай для апісання эскалацыі гвалту ў сем’ях і вёсках»[29], пры напісанні гэтага твора, на жаль, скарыстаць ужо нельга было. Дакументамі з архіваў КДБ, датычнымі савецкіх пасляваенных працэсаў, якія праводзіліся супраць мясцовых нямецкіх памагатых, рашэннем прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, з 1996 г. гісторыкі карыстацца больш не могуць[30].

Давялося адмовіцца і ад пашырэння базы сведчанняў праз свае інтэрв’ю з жывымі яшчэ сведкамі. Побач з прынцыповай праблемай скажоных успамінаў, змяшання сапраўды перажытага з тым, пра што часта распавядалася, ці зведанага іншым шляхам, а таксама па прычыне абмежаваных магчымасцей памяці пасля больш чым 60 гадоў[31], глыбокая ўкарэненасць ідэалагічных узораў, якая навязвалася на працягу дзясяткаў гадоў у Савецкім Саюзе, напрыклад, як трэба ўспамінаць пра «Вялікую Айчынную вайну», несла ў сабе дадатко-

[28] Дакладна аб гэтым відзе крыніц і гісторыі іх паходжання гл.: Gross J. Und wehe, du hoffst… Die Sowjetisierung Ostpolens nach dem Hitler-Stalin-Pakt 1939—1941. Freiburg i.Br., 1988. S. 11—17.

[29] Chiari B. Alltag hinter… S. 23 і наст.

[30] Leonid Smilovitsky. Рэцэнзія: Kagan J., Cohen D. Surviving the Holocaust with the Russian Jewish Partisans. London, Portland, OR, 1998 // Holocaust and Genocide Studies. 2001. № 15. P. 335—341.

[31] Гл.: на гэты конт: Welzer H., Moller S., Tschuggnall K. «Opa war kein Nazi». Nationalsozialismus und Holocaust im Familiengedächtnis. Frankfurt a.M., 2002. S. 105—128.

выя цяжкасці[32]. Па прычыне Халакосту і пасляваеннага перасялення польскага насельніцтва колішніх *крэсаў* сюды дадаецца цалкам змененая ў параўнанні з даследаваным часам сацыяльная і нацыянальная структура тамашняга насельніцтва. З усіх гэтых прычын здаецца сумнеўным, ці варты чаканыя вынікі тых вялікіх затрат, якіх запатрабавала б масавае ўключэнне ў гэтую працу «oral history» (вуснага аповеду)[33].

Калі нават пакуль што няма абагульняючага даследавання падзей 1939—1941 гг. у Заходняй Беларусі, усё ж такі існуюць шматлікія працы па асобных аспектах, карысныя пры разглядзе гэтай тэмы. Савецкая акупацыя ўпершыню была апісана Янам Томашам Гросам у 1986 г. у яго кнізе «Revolution from Abroad» («Рэвалюцыя з-за мяжы»)[34]. З той прычыны, што савецкія архівы ў той час былі яшчэ закрытыя, у сваім даследаванні ён абапіраўся выключна на *рэляцыі*. Хоць увогуле яго аб'ёмная праца і ўдалася, яна, аднак, патрабуе значнай карэктуры ў шматлікіх пунктах, асабліва адносна колькасці ахвяр. Крах камуністычнага рэжыму ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе стварыў спачатку, найперш у Польшчы, атмасферу, якая дала магчымасць крытычна заняцца гэтымі цёмнымі, занядбанымі дагэтуль, старонкамі гісторыі. Адкрыццё савецкіх архіваў дадаткова дало польскім гісторыкам матэрыяльны грунт для маштабных даследаванняў. Са шматлікіх артыкулаў, зборнікаў і манаграфій тут варта нагадаць чатыры: Альбін Главацкі ў 1998 г. прадставіў агляд савецкай акупацыі на польскіх усходніх тэрыторыях, які па сваіх памерах і грунтоўнасці адсунуў у цень усе папярэднія, і таму ў гэтай працы ў многіх месцах ёсць магчымасць прыцягваць яго для дэманстрацыі савецкай палітыкі[35]. Аднак даследаванне не пазбаўлена пэўнай касабокасці, якая палягае, у першую чаргу, у інтэрпрэтацыі савецкіх матываў, якія Главацкі часам аднабакова інтэрпрэтуе з нацыянальных пунктаў гледжання[36]. У тым самым можна папракнуць і Марака Вяжбіцкага, які ў дзвюх манаграфіях разглядае польска-яўрэйскія і польска-беларускія адносіны і пры гэтым у значнай ступені абапіраецца на *рэляцыі*[37]. Аднак Вяжбіцкі ўзбагачае нашае раз-

[32] Гл.: Bonwetsch B. «Ich habe an einem völlig anderen Krieg teilgenommen». Die Erinnerung an den «Großen Vaterländischen Krieg» in der Sowjetunion // Krieg und Erinnerung; Bonwetsch B. Die Sowjetunion im Krieg 1941 bis 1945: der «Große Vaterländische Krieg» // Jahrbuch für historische Kommunismusforschung. 2005.

[33] Chiari B. Mythos und Alltag: Voraussetzungen und Probleme eines west-östlichen Dialogs zur Historiographie des Zweiten Weltkrieges // MGM. 1995. № 54. S. 542.

[34] Па-нямецку: Gross J. Und wehe...

[35] Głowacki A. Sowieci wobec Polaków na ziemiach wschodnich II Rzeczypospolitej 1939—1941. Łódź, 1998

[36] Гл. на гэты конт падраздзел IV.1. гэтага даследавання.

[37] Wierzbicki M. Polacy i Żydzi w zaborze sowieckim. Stosunki polsko-żydowskie na ziemiach północno-wschodnich II RP pod okupacją sowiecką (1939—1941). Warszawa, 2001; Wierzbicki M. Polacy i Białorusini w zaborze sowieckim. Stosunki polsko-białoruskie na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej pod okupacją sowiecką (1939—1941). Warszawa, 2000.

уменне ўзаемаадносін паміж рознымі нацыянальнымі групамі. Тое самае ўдаецца і Кшыштафу Ясевічу ў яго манументальным даследаванні акупацыйнага персаналу ў Заходняй Беларусі, у якім ён, перш за ўсё, разглядае яго этнічны склад[38]. Шматлікія артыкулы Яўгена Разенблата прысвечаны таксама гэтай тэме, прычым ён, у адрозненне ад Вяжбіцкага, выбірае не польскую, а яўрэйскую перспектыву, і даследуе адносіны неяўрэяў да суседзяў-яўрэяў[39].

На перыяд нямецкай акупацыі ў згаданай ужо дысертацыі Герлаха мы маем шмат у чым вельмі пераканаўчае даследаванне нямецкай палітыкі, якое, аднак, у некаторых пунктах патрабуе рэвізіі. Мясцовае насельніцтва амаль не прадстаўлена, што і было задумана аўтарам[40]. Тым не менш, яе ўвесь час можна выкарыстоўваць у гэтай працы для паказу акупацыйнай палітыкі. Такое ж прынцыповае значэнне мае ўжо згаданая праца Бернгарда К'яры, які, да таго ж, у шматлікіх публікацыях звяртаецца да розных аспектаў нямецкай акупацыйнай палітыкі ў Беларусі[41]. У адрозненне ад Герлаха, ён закранае не толькі нямецкі бок, але і стварае карціну ваеннага грамадства. Савецкія і постсавецкія агульныя даследаванні акупацыйнага рэжыму не дасягаюць якасці гэтых дзвюх прац[42]. Гэта тычыцца і шматлікіх савецкіх прац аб партызанскай вайне, якія нязменна інтэрпрэтуюць яе згодна са сталінскім вызначэннем «всенародная борьба» як супраціўленне ўсяго народа супраць немцаў. Такія феномены, як супрацоўніцтва мясцовых жыхароў з акупацыйным рэжымам ці стрыманая пазіцыя адносна абодвух бакоў, разглядаюцца гэтак жа мала, як і негатыўныя аспекты ўзаемаадносін паміж партызанамі і астатнім насельніцтвам. Менавіта гэтым аспектам прысвячаецца выдадзеная ў 2004 г. Богданам Мусялам публікацыя

---

[38] Jasiewicz K. Pierwsi po diable. Elity sowieckie w okupowanej Polsce 1939—1941. (Białostocczyzna, Nowogródczyzna, Polesie, Wileńszczyzna). Warszawa, 1998.

[39] Розенблат Е. Евреи в системе межнациональных отношений в западных областях Беларуси. 1939—1941 гг. // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 2000. № 13; Розенблат Е. Межнациональные отношения в западнобелорусских городах и местечках в 1939—1941 гг. // Štetl; Rosenblat E. Polacy, Białorusini i Żydzi na Polesiu w perwszych tygodniach wojny niemiecko-radzieckiej // Początek wojny niemiecko-sowieckiej; Розенблат Е. Советизация и антисемитизм в западнобелорусских землях. 1939—1941 гг. // Sowietyzacja i rusyfikacja.

[40] Gerlach C. Kalkulierte Morde… S. 19—24.

[41] Гл., напр.: Chiari B. Die Kriegsgesellschaft Weißrusslands im Zweiten Weltkrieg (1939—1944) // Handbuch der Geschichte Weißrusslands; Chiari B. Grenzen deutscher Herrschaft. Voraussetzungen und Folgen der Besatzung in der Sowjetunion // Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg. 9/2; Chiari B. Die Büchse der Pandora. Ein Dorf in Weißrussland 1939—1944 // Die Wehrmacht; Chiari B. Geschichte als Gewalttat. Weißrussland als Kind zweier Weltkriege // Erster Weltkrieg — Zweiter Weltkrieg.

[42] Гл., напр.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии 1941—1944. Изд. З. И. Белуга [и др.]. Минск, 1965; Белуга З. [и др.] Нацистская политика геноцида и «выжженной земли» в Белоруссии (1941—1944). Минск, 1984; Кравченко И., Залесский А. Белорусский народ в годы Великой Отечественной войны. Минск, 1959.

партызанскіх дакументаў з Баранавіцкай акругі[43]. Апублікаваныя там, большай часткай упершыню, дакументы малююць змрочную карціну паводзін партызанаў у адносінах да цывільнага насельніцтва, яны паведамляюць пра рабаўніцтвы і згвалтаванні. Праўда, надрукаваныя крыніцы не даюць уяўлення пра тое, наколькі распаўсюджаныя былі апісаныя феномены, былі яны толькі выключэннем ці правілам партызанскай вайны[44]. У рамках гэтага даследавання робіцца спроба атрымаць адпаведныя сведчанні.

Значна лепей — бо шматперспектыўна і ўвогуле больш крытычна — выглядае даследаванне феномена супрацоўніцтва мясцовых жыхароў з немцамі. У прыватнасці, беларускі гісторык Аляксей Літвін у рамках сваёй дысертацыі даследаваў розныя аспекты ваеннага і паўваеннага супрацоўніцтва[45]. Наконт удзелу ахоўных камандаў у гвалтоўных злачынствах у адносінах да цывільнага насельніцтва Марцін Дын напісаў манаграфію, а таксама серыю артыкулаў, якія грунтуюцца, у першую чаргу, на дакументах пасляваенных працэсаў[46]. Карысны агляд усіх сфер супрацоўніцтва ўяўляе сабой дысертацыя Ігара Сервачынскага[47]; пра створаныя немцамі моладзевыя аб'яднанні ў Беларусі надзейна інфармуе праца Аляксандра Кавалені[48]. Праўда, абодва ў сваіх выкладах бываюць занадта агульнымі, каб можна было рабіць высновы аб канкрэтнай сітуацыі на месцах па-за Мінскам.

---

[43] Sowjetische Partisanen…

[44] Гл. рэцэнзію: Chiari B. // JBfGOE. 2006. № 54. S. 116 і наст., у якой ён патрабуе дакладнага даследавання і колькаснай ацэнкі на аснове выбраных мясцовых даследаванняў.

[45] Літвін А. Антыфашысцкая барацьба на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі (1941—1944 гг.) // Назаўсёды разам...; Літвін А. Антысавецкія ваенна-паліцэйскія фармаванні на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941—1944 гг. Вытокі. Структура. Дзейнасць. Аўтарэферат дысертацыі на саісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук. Мінск, 2000; Літвін А. Армія Краёва на Беларусі: да праблемы вывучэння // БГЧ. Частка 1. 1/1994. С. 65—73; Частка 2. 4/1994. С. 65—69; Литвин А. Местная вспомогательная полиция на территории Беларуси (июль 1941 — июнь 1944 гг.) // Беларусь у XX стагоддзі. Вып. 2. С. 212—227; Літвін А. Беларуская самаахова: да пытання стварэння і дзейнасці // Старонкі ваеннай гісторыі. Вып. 2. Мінск, 1998. С. 39—71.

[46] Dean M. Collaboration in the Holocaust. Crimes of the Local Police in Belorussian and Ukraine, 1941—1944. Basingstoke, 2000; Dean M. Microcosmos: Collaboration and Resistance during the Holocaust in the Mir Rayon of Belarus, 1941—1944 // Collaboration and Resistance during the Holocaust. P. 223—259; Dean M. Polen in der einheimischen Hilfspolizei. Ein Aspekt der Besatzungsrealität in den deutsch besetzten ostpolnischen Gebieten // Die polnische Heimatarmee. S. 355—368.

[47] Сервачынскі І. Калабарацыянізм на акупіраванай тэрыторыі Беларусі (1941—1944) // Весці Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. 1997. № 2. С. 61—70; Сервачинский И. Коллаборационизм на оккупированной территории Беларуси (июнь 1941 — август 1944). Минск, 1998 (= унив. дисс., Минск).

[48] Каваленя А. Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі. 1941—1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць. Мінск, 1999.

***

Каб забяспечыць адзінства напісання, усе населеныя пункты, лясы і г. д., калі яны знаходзіліся на тэрыторыі міжваеннай польскай дзяржавы, у нямецкім выданні гэтай кнігі падаваліся ў іх польскім напісанні. Пры гэтым аўтар прытрымліваўся прынцыпаў міжнароднага права, адпаведна якім заходнія тэрыторыі сучаснай Беларусі паводле ўмоваў Рыжскага дагавора, заключанага ў 1921 г. паміж Савецкай Расіяй і Польшчай, належалі Польшчы. Дадатковы ж сакрэтны пратакол да гітлераўска-сталінскага пакта не меў міжнароднай сілы. Тэрыторыі, якія яшчэ да 1939 г. належалі да Савецкага Саюза, перадаваліся паводле рускамоўнага напісання.

Адносна людзей было імкненне называць іх адпаведна нацыянальнасці: палякаў — па-польску, рускіх і савецкіх функцыянераў — па-руску, беларусаў — па-беларуску. У сумнеўных выпадках выкарыстоўвалася польскае напісанне. Перавага польскага напісання мела толькі гістарычныя і прагматычныя прычыны і не ставіць пад сумненне ні прыналежнасць колішніх крэсаў да сённяшняй Рэспублікі Беларусь, ні дае ацэнкі таму, наколькі праведзеная згодна з Рыжскім мірным трактатам мяжа адпавядала інтарэсам насельніцтва[49]. З гэтай прычыны ў нямецкамоўным тэксце побач з азначэннямі *«kresy wschodnie»* (усходнія крэсы), *«Ostpolen»* («Усходняя Польшча») і «ostpolnisch» («усходняпольскі») ужываюцца, чаргуючыся з імі, таксама *«westweißrussisch»* («заходнебеларускі») і *«Westweißrussland»* («Заходняя Беларусь»).

[Дадзеныя прынцыпы, якіх аўтар паслядоўна трымаўся пры падрыхтоўцы арыгінальнага нямецкамоўнага тэксту, натуральна, пры падрыхтоўцы беларускамоўнага перакладу ў значнай ступені страцілі сваю актуальнасць. У гэтым перакладзе і назвы населеных пунктаў, і імёны прыводзяцца ў пераважнай большасці выпадкаў у беларускім варыянце, без залежнасці ад даваеннай тэрытарыяльнай прыналежнасці мясцовасці і этнічнай прыналежнасці асобы. Выключэнні бываюць толькі ў спасылках, дзе прозвішчы інфарматараў прыводзяцца, як і ў аўтара, у польскім варыянце, паколькі сапраўднае іх гучанне высветліць бывае надзвычай складана. У той жа час шырокае выкарыстанне аўтарам тэрмінаў «крэсы» ці «Усходняя Польшча» ў дачыненні да сучасных беларускіх тэрыторый збольшага захоўвалася, нягледзячы на разуменне намі іх кантраверсійнасці ў сучасных умовах. — **Заўв. рэд.**]

[49] Беларуская гістарыяграфія абгрунтоўвае спасылкай на «гістарычную несправядлівасць» ліквідацыю мяжы, усталяванай у 1921 г. Гл. напр.: Kren' I. P. Der Einsatz der Armia Krajowa auf dem Territorium Weißrusslands aus weißrussischer Sicht. Versuch einer Ortsbestimmung // Die polnische Heimatarmee. S. 591—594. Аднак пры гэтым акрамя таго, што яна ігнаруе міжнароднае права, сканструяваная ёй гістарычная паслядоўнасць выклікае сумневы. Гл. на гэты конт: Lindner R. Weißrussland im Geschichtsbild seiner Historiker // Handbuch der Geschichte Weißrusslands. S. 25.